*УДК 811.161.3‘42:801.66:398.831(=161.3)*

**Н. В. Барсукова**
***Навук. кір. – А. А. Станкевіч, д-р філал. навук, прафесар***

# РЫФМА ЯК СРОДАК ПРЫЦЯГНЕННЯ ЎВАГІ СЛУХАЧА Ў БЕЛАРУСКІХ НАРОДНЫХ КАЛЫХАНКАХ

*У артыкуле на матэрыяле беларускіх народных калыханак разглядаецца рыфма як сродак прыцягнення ўвагі слухача. Апісваюцца віды рыфмаў паводле месца знаходжання ў вершаваным радку, складовага аб‘ёму, у залежнасці ад колькасці і якасці гукавых супадзенняў, паводле дакладнасці сугуччаў. Акрэсліваюцца рытмастваральная, кампазіцыйная, сэнсавыдзяляльная функцыі рыфмы.*

Дзіцячы фальклор адыгрывае важную ролю ў жыцці маленькага чалавека, у фарміраванні яго ўяўленняў пра навакольны свет, у развіцці маўлення і пад. Першае знаёмста з творамі для дзяцей ажыццяўляецца праз сустрэчу з калыханкамі. Паколькі калыханкі спяваюць дзецям, якія пакуль не разумеюць сэнсу слоў, якіх прываблівае гучанне калыханкі, яе мілагучнасць, складнасць, то зразумелым з‘яўляецца наяўнасць рыфмы, якая павялічвае гукапісныя магчымасці твора, уплывае на яго гукавую арганізацыю.

Пад **рыфмай** разумеюць «паўтаральную сугучнасць асобных слоў ці іх частак на адных і тых жа месцах у вершаваных радках» [1, с. 285]. Існуе мноства класіфікацый відаў рыфмаў паводле розных крытэрыяў.

Паводле месца знаходжання ў вершаваным радку выдзяляюць рыфмы: ***пачатковыя***, калі сугучныя словы стаяць у пачатку суседніх радкоў: *«Хадзіў каток па капусце, / Насіў сончык ў белай хустцы»* [2, с. 68]; ***унутраныя***, калі адно з сугучных слоў знаходзіцца ў сярэдзіне, а другое – у канцы аднаго і таго ж радка: *«Брэнчы муха каля вуха, / Калыбку махаю»* [2, с. 67]; **канцавыя** – рыфмы, заснаваныя на сугучнасці канцавых слоў. *«Люлі-люлі, люляю, / Наб‘ю катка, налаю. // Ты каток, к нам не хадзі, / Майго дзіцяці не будзі. // Ты коця-варкоця, // Маё дзіця спаць хоча»* [2, с. 88]. Апошні самы распаўсюджаны від рыфмы ў калыханках: радкам надаецца большая рытмічнасць.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

Па складовым аб‘ѐме выдзяляюць рыфмы: мужчынскія, жаночыя, дактылічныя і гіпердактылічныя. У калыханках гіпердактылічныя рыфмы не сустракаюцца, а астатнія маюць месца.

Найбольш пашырана **жаночая рыфма** – від рыфмы, у якой націск падае на перадапошні (другі ад канца) склад сугучных слоў. На такой рыфме нярэдка пабудавана ўся калыханка, што садзейнічае яе напеўнасці, меладычнасці: *«Люлі-люлі, люляшу, / Я дзіцятка калышу, / Нітачку звіваю, / Песеньку спяваю»* [2, с. 66].

***Мужчынская*** рыфма – рыфма, пры якой націск у сугучных словах падае на апошні склад.

Сярод мужчынскіх рыфмаў выдзяляюць адкрытыя, калі склад заканчваецца на галосны гук, і закрытыя, калі на зычны. Тэкст калыханкі можа складацца толькі з мужчынскіх закрытых рыфмаў: *«Пайшоў каток у лясок, / Прынѐс каток паясок, / Паясочак адабраць, / А Ванюшку яго даць, / Ваня будзе сладка спаць, / А я буду калыхаць»* [2, с. 106], ці з чаргавання адкрытых і закрытых мужчынскіх і жаночых (у 1 і 2, 5 і 6 радках) рыфмаў: *«Ходзіць каток па вароцях / У чырвоненькіх чабоцях. // Упаў кот із варот, / Запіў спінку і жывот. // Ката біці па спіне, / Штоб нарубаў лучыны. // Ката біці па хвасту, / Штоб нарубаў хварасту. // Ой ты, коця, не варчы, / А ты, Жэня, спі, маўчы»* [2, с. 88].

Канешне, мужчынскія рыфмы саступаюць месца жаночым, якія багацейшыя за іх, аднак яны адыгрываюць немалаважную сэнсавыдзяляльную ролю ў калыханках.

Радзей за вышэй разгледжаныя віды рыфмы сустракаецца ***дактылічная*** рыфма – від рыфмы, у якой націск у сугучных словах падае на трэці ад канца склад сугучных слоў [1, с. 312]: *«Што выведу нітачку – / Камару на світачку. // Астануцца кончыкі – / Камару на штончыкі»* [2, с. 67].

Дактылічная рыфма часта выкарыстоўваецца ў спалучэнні з жаночай, мужчынскай, што ―робіць рытміка-інтанацыйны малюнак вершаванага твора больш разнастайным‖ [1, с. 312-313]. Найчасцей у калыханках дактылічная рыфма спалучаецца з мужчынскай: *«Ой, ой, баінькі, / Каток маленькі. // Пайшоў каток у лясок, / Знайшоў паясок. / Ой, ой, баінькі, / Каток маленькі. // Іванку абвязаць, / Штобы ціха спаць»* [2, с. 110].

У наступнай калыханцы ў 1 і 2, 3 і 4 радках у дактылічнай рыфме не супадаюць націскныя галосныя, але за кошт супадзення апошніх чатырох гукаў [ушк‘і] у сугучных словах 1 і 2 радкоў і супадзення большасці зычных гукаў – [р], [н], [ч], [к] – і галоснага [а] у састаўной дактылічнай рыфме, гэта несупадзенне не заўважаецца пры

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

вымаўленні: *«Баю-баю-баюшкі! // Люлі-люлі-люлюшкі! // Пайшоў коцік на рыначак, / Прынёс Вані бараначак. // Пайшоў коця на таржок, / Прынёс Вані піражок. // Ой, брысь, коця, не варчы, / А ты, Ваня, замаўчы, / Закрый глазкі і засні. // Баю-баю-баюшкі! // Люлі- люлі-люлюшкі!»* [2, с. 114].

У залежнасці ад колькасці і якасці гукавых супадзенняў выдзяляецца наступныя віды рыфмаў.

***Багатая*** рыфма – рыфма, пры якой у сугучных словах супадае больш за 2 гукі: *«Спі, дачушка, спі, / Ды аб долі сні. // Маці будзе калыхаці, / Будзе песеньку спяваці»* [2, с. 64].

Справядліва адзначае В. П. Рагойша, калі гаворыць, што ―дакладныя жаночыя рыфмы заўсѐды багацейшыя за мужчынскія, а дактылічныя – за жаночыя‖ [1, с. 301], але для калыханак толькі першая палова выказвання з‘яўляецца даставернай. Дакажам гэта на прыкладах.

У калыханцы ў 1 і 2 радках мужчынская закрытая багатая (паўтараюцца 3 гукі, адзін з якіх пераднаціскны санорны зычны, што яшчэ больш узбагачае яе) рыфма, аднак гэта рыфма ўсѐ ж саступае жаночай багатай рыфме ў 3 і 4 радках, у якой паўтараюцца 4 гукі, з якіх 3 паслянаціскныя: *«Спі, Валюшанька, не плач, / Купім мы табе калач. // Мѐдам пamажам, / Нікому не пакажам»* [2, с. 128].

У наступным чатырохрадкоўі рыфмуюцца 1 і 2 радок глыбокай багатай (6 гукаў) жаночай рыфмай, а 3 і 4 – багатай (5 гукаў) дактылічнай, аднак, як бачым, тут большай выразнасцю і экспрэсіўнасцю валодае жаночая рыфма: *«Узяла бабка паленца, / Разбіла катку каленца. // Пайшоў каток скачучы, / За ім бабка плачучы»* [2, с. 125].

***Глыбокай*** называецца рыфма, у якой, акрамя націскных складоў, супадае некалькі пераднаціскных гукаў: *«Адна кажа: – Шаляжок. // А другая: – Піражок»* [2, с. 150]; *«Люляй-люляй, дзіця спаць, / Няма каму калыхаць, / А я, маладзенька, / Пагуляць радзенька»* [2, с. 176].

***Бедная*** рыфма – гэта такая рыфма, у якой супадаюць толькі націскныя галосныя: *«Думаў каток, думаў, / Думаў ды надумаў: / І сам разок укушу, / І дзіцяці занясу»* [2, с. 129].

У калыханках перавага аддаецца багатым і глыбокім рыфмам, а бедным у меншай ступені, паколькі ў выніку вялікай колькасці гукавых супадзенняў дасягаецца большая выразнасць і складнасць рыфм. Бедныя рыфмы, як правіла, сутракаюцца ў спалучэнні з багатымі і глыбокімі, чаргуюцца з імі.

Паводле дакладнасці сугуччаў вылучаюць ***дакладную (поўную)*** – рыфму, у якой супадаюць націскныя і паслянаціскныя гукі – і



РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

***недакладную (прыблізную, няпоўную)*** – тэрмін, які ўжываецца ў адносінах да рыфмаў з няпоўным супадзеннем гукаў у сугучных словах [1, с. 323]. Прыклад дакладнай рыфмы: *«А ты, коце стракаты, / Просім цябе дахаты»* [2, с. 72].

Да недакладных рыфмаў адносяцца наступныя: асанансныя, кансанансныя, апорныя, усечаныя, рознанаціскныя, анаграмныя. З названых у калыханках сустракаюцца асанансныя, апорныя і рознанаціскныя.

***Асанансная*** рыфма, у якой у сугучных словах супадаюць толькі галосныя гукі: *«Прыйдзі, прыйдзі, коця, / Маня спаці хоча»* [4, с. 74]; *«Ой, лелю-лелю, / Праў кот кудзелю / Не стала валу – / Падлез пад лазу»* [2, с. 99].

***Апорная***, або карнявая, рыфма – рыфма, у якой супадаюць націскныя, т. зв. апорныя, склады (пераднаціскны зычны і націскны галосны), у той час як паслянаціскныя склады не супадаюць [1, с. 298]: *«Котка шэры, /Котка белы, / Котка валахаты, / Хадзі дзіця калыхаці»* [2, с. 71]; *«Цішай, коцік, не бурчы, / Майго Ваню не будзі»* [2, с. 75].

***Рознанаціскная*** (няроўнаскладовая) – рыфма, у якой націскі падаюць на розныя склады сугучных слоў [1, с. 328]: *«Не хадзі, кот, па паліцы, / Буду біць па патыліцы»* [2, с. 86].

Паколькі мова народных калыханак не ўнармаваная, як мова літаратурных твораў, то сустракаюцца адхіленні ад літаратурных норм, і таму можа мяняцца і якасць рыфмы. Так, па ўсіх нормах беларускай літаратурнай мовы трэба пісаць слова абодва ў прыведзеным ніжэй кантэксце і тады была б утворана чыстая рознанаціскная рыфма, а ў прыведзеным ніжэй урыўку калыханкі і ў падобных тэкстах калыханак дзеля сугучнасці ў няроўнаскладовых сугучных словах націск падае на апошні склад: *«А-а, а-а, каткі, два, / Шэры, белы – абадва*» [2 с. 71].

У наступных прыкладах у сугучных словах аднолькавая колькасць складоў, а з прычыны таго, што націск падае на розныя складаўтваральныя гукі: у першым прыкладзе ў сугучных словах на галосныя [о] і [у], у другім – на [у] і [а], іх можна лічыць рознанаціскнымі, але не няроўнаскладовымі. *«Ой, сонечыку-галубоч (ы) ку, / Прыспі маю Ганулеч (ы) ку»* [2 с. 68]; *«– А я есці не хачу, / Па сваім горы плачу»* [2, с. 97], – у 1 прыкладзе сугучныя словы маюць падобную гукавую арганізацыю, таму словы слаба выдзяляюцца ў маўленчай плыні, а ў 2 – слова *хачу* больш выдзяляецца, што звязана з жаданнем акцэнтаваць увагу слухачоў на змесце калыханкі.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

У залежнасці ад колькасці рыфмаў у страфе рыфмоўка бывае **парнай** (спалучае два суседнія радкі), **трайной** (тры), **чацвярной** (чатыры) і **мнагакратнай** (пяць і больш суседніх радкоў). Самай распаўсюджанай з‘яўляецца парная рыфмоўка: *«Люлі-люлі-люлі, / Ўсе дзеткі паснулі, / А ты мой сыночак, / Не спіш, не гуляеш, / З катком размаўляеш»* [2, с. 63]; *«Люлі-люлі, люляшу, / Я дзіцятка калышу, / Нітачку звіваю, / Песеньку спяваю. // Што выведу нітку / Камару на світку. //Астануцца кончыкі / Камару на штончыкі»* [2, с. 63].

Трайная і чацвярная часта спалучаюцца з парнай, як у наступнай калыханцы, у якой 1, 2 і 3 – закрытая багатая мужчынская трайная рыфма, 4, 5, 6, 7 – адкрытая мужчынская багатая чацвярная рыфма, 8 і 9 радкі – жаночая багатая парная рыфма: *«Люлі-люлі-люлі, спаць, / Да я ж буду калыхаць, / Буду песеньку спяваць: / —Ходзіць пава па таку / У чырвоным калпаку. // А пан кажа: – Засяку. // Пава кажа: – Уцяку, / А я пана не баюся. // Я ад пана абаранюся»* [2, с. 63].

Акрамя вышэй разгледжаных, існуюць і іншыя віды рыфмаў. Рыфмы бываюць ***простыя***, калі сугуччы – два самастойныя словы, і ***састаўныя***, калі –адна ці нават дзве часткі складаюцца не з аднаго, а з двух і больш слоў‖. Прыклады састаўной рыфмы: *«Ходзіць каток па сяле / Носіць дзіця ў кашале»* [2, с. 70]; *«Ой ты, котка / Валахаты, / Не хадзі / Каля хаты»* [2, с. 76].

Выдзяляюць ***граматычную***, або ***аднародную***, рыфму – рыфма, у якой словы-сугуччы стаяць у адной граматычнай форме, і ***разнародную*** рыфму – рыфма, што спалучае розныя часціны мовы ў неаднолькавых граматычных формах. Як правіла, граматычная і разнародная рыфмы ў тэкстах калыханак спалучаюцца: *«Баюшкі-баю, / Не лажыся на краю, / Прыйдзе шэранькі ваўчок, / Схопіць Таньку за бачок, / Аднясець у кусцік / І назад не пусціць»* [2, с. 170]. Словы-сугуччы *ваўчок, бачок* і з імі адно з сугучных слоў другой пары *кусцік* стаяць у форме Н. скл. адз. л., а дзеяслоў *пусціць* стаіць у форме буд.часу 3 ас.

Такім чынам, рыфмарый беларускіх народных калыханак багаты і разнастайны. З усіх відаў рыфмаў найчасцей у калыханках сустракаюцца канцавыя, багатыя, жаночыя і мужчынскія, дакладныя, простыя і састаўныя, граматычныя рыфмы, парныя рыфмоўкі. Рыфма выконвае перш за ўсѐ рытмастваральную, кампазіцыйную, сэнсавыдзяляльную ролю. Яна дапамагае прыцягнуць увагу да твора, дзякуючы сваѐй меладычнасці – усыпіць дзіця.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

## Спіс літаратуры

1 Рагойша, В. П. Паэтычны слоўнік / В. П. Рагойша. – Мінск: Вышэйшая школа – 3-е выд., дапрац. і дапоўн., 2004. – 576 с.

2 Дзіцячы фальклор / Рэд. В. К. Бандарчык; АН БССР. Ін-т мастацтвазнаўства, этнаграфііі і фальклору. Беларус. нар. творчасць. – Мінск: Навука і тэхніка, 1972. – 743 с.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ